# ДА ПРАБЛЕМЫ ФАРМІРАВАННЯ ТАПАНІМІЧНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ ШКОЛЬНІКАЎ

***Вагулька М. А.*** *(УА БДПУ імя М. Танка, Мінск)*
***Навуковы кіраўнік*** *– А. С. Васілеўская, канд. філал. навук, дацэнт*

Згодна з канцэпцыяй вучэбнага прадмета “Беларуская мова” (V–XI класы) агульнай сярэдняй адукацыі (для агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання) у вучняў II–III ступеняў павінны быць сфарміраваны наступныя ***прадметныя кампетэнцыі:*** *моўная, маўленча-камунікатыўная, лінгвакультуралагічная* [1]. На наш погляд, цесна звязана з адзначанымі тапанімічная кампетэнцыя.

Тапаніміка – раздзел анамастыкі. Яна цесна звязана з іншымі навукамі, бо тапанімічныя назвы могуць быць аб’ектам вывучэння і гісторыі, і геаграфіі, і літаратуры [2]. Таму вывучэнне тапанімічнай лексікі патрабуе не толькі добрага валодання прыёмамі лінгвістычнага аналізу слова, але і глыбокага ведання гісторыі свайго і суседніх народаў, геаграфіі розных краін, дасведчанасці ў праблемах мастацкай літаратуры. Таму можна гаварыць пра фарміраванне тапанімічнай кампетэнцыі ў іерархіі прадметных кампетэнцый.

Мы паспрабавалі апісаць структуру гэтай кампетэнцыі, карыстаючыся распрацоўкамі А. В. Хутарскога [3]:

– **назва кампетэнцыі**: тапанімічная;

– **тып кампетэнцыі ў агульнай іерархіі**: тапанімічную кампетэнцыю можна аднесці да прадметных. Тапонімы разглядаюцца як частка лексічнай сістэмы пэўнай мовы, таму фарміраванне тапанімічнай кампетэнцыі адбываецца на ўроках мовы і літаратуры. Але фарміраванне кампетэнцыі можа адбывацца і на ўроках па іншых прадметах (гісторыя, геаграфія і інш.);

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

– **кола рэальных аб'ектаў, па адносінах да якіх уводзіцца кампетэнцыя**, складаюць тапонімы – уласныя назвы геаграфічных аб'ектаў: *гідронімы* – назвы рэк і азёраў, *айконімы* – назвы паселішчаў, *урбанонімы* – назвы ўнутрыгарадскіх аб'ектаў (вуліц, паркаў, сквераў, кінатэатраў), *аронімы* – назвы ўзвышшаў;

– **сацыяльна-практычная абумоўленасць і значымасць кампетэнцыі**: фарміраванне тапанімічнай кампетэнцыі дазволіць не толькі замацаваць уяўленне пра сістэму тапанімічных назваў Беларусі, але і паспрыяе фарміраванню камунікатыўных навыкаў, правільнаму ўжыванню моўных сродкаў для рэалізацыі пэўных камунікатыўных задач, далучэнню да агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей;

– **сэнсавыя арыентацыі вучня ў адносінах да дадзеных аб'ектаў**: фарміраванне тапанімічнай кампетэнцыі дазволіць школьнікам арыентавацца ў геаграфічнай прасторы Беларусі і іншых краін;

– **веды пра дадзенае кола рэальных аб'ектаў**: на нашу думку, вучні II ступені атрымання агульнай сярэдняй адукацыі павінны ведаць: 1) асноўныя тыпы тапонімаў і спецыфіку іх ужывання, 2) асноўныя асаблівасці і адметнасці беларускай тапанімікі, 3) правапіс назваў населеных пунктаў, 4) асаблівасці скланення назваў населеных пунктаў, 5) асаблівасці вызначэння роду тапанімічных назваў;

– **уменні і навыкі, якія адносяцца да гэтага кола рэальных аб'ектаў**: вучні II ступені навучання павінны ўмець: 1) ужываць тапонімы ў адпаведнасці з нормамі беларускай літаратурнай мовы, 2) вызначаць род тапанімічных назваў, 3) скланяць назвы населеных пунктаў, 4) утвараць катайконімы і ад'ектонімы ад тапонімаў, 5) суадносіць тапанімічныя назвы з геаграфічнымі аб'ектамі, 6) аналізаваць экстралінгвістычную інфармацыю, закладзеную ў тапонімах, што выкарыстоўвацца ў мастацкай літаратуры;

– **спосабы дзейнасці ў адносінах да дадзенага кола рэальных аб'ектаў** (метады і прыёмы працы з тапанімічнай лексікай). Заданні, накіраваныя на фарміраванне акрэсленых уменняў і навыкаў, прапануюцца толькі пры вывучэнні правапісу ўласных назваў і скланення прозвішчаў на -*оў, -ёў, -аў, -еў, -ін, -ын.* У падручніку мы сустракаем наступныя заданні: *спішыце, раскрываючы дужкі, пастаўце словы ў адпаведным склоне.* Аднак заданні такога тыпу дазваляюць вырашаць пастаўленыя праблемы толькі часткова;

– **мінімальна неабходны вопыт дзейнасці вучня ў сферы дадзенай кампетэнцыі**: для фарміравання тапанімічнай кампетэнцыі ў вучняў 5–9 класаў трэба ўлічваць, што школьнікі ўжо маюць пэўны запас ведаў па ўсведамленні сутнасці тапанімічных назваў, уменняў ужывання тапонімаў ва ўласным маўленні;

– **індыкатары-прыклады, узоры вучэбных і кантрольна-ацэначных заданняў**: на нашу думку, раскрыццё гэтага кампанента кампетэнцыі патрабуе асобнага даследавання, заснаванага на аналізе праграм па мове і літаратуры, падручнікаў па гэтых прадметах.

Такім чынам, вылучэнне тапанімічнай кампетэнцыі ў якасці асобнай ставіць канкрэтныя задачы як перад настаўнікамі, так і перад выкладчыкамі вышэйшых навучальных устаноў, якія рыхтуюць настаўнікаў. З аднаго боку, пры распрацоўцы падручнікаў па мове і літаратуры неабходна ўлічваць спецыфіку фарміравання гэтай кампетэнцыі і ўключаць у вучэбны матэрыял заданні, звязаныя з выпрацоўкай уменняў і навыкаў па ўжыванні тапанімічных назваў. З другога боку, будучыя настаўнікі павінны атрымаць неабходнае кола ведаў, якое дазволіць працаваць над фарміраваннем тапанімічнай кампетэнцыі.

Літаратура

1. Канцэпцыя вучэбнага прадмета «Беларуская мова» [Электроны рэсурс]. – Рэжым доступу : www.adu.by. – Дата доступу : 18.12.2015.

2. Хуторской, А. В. Технология проектирования ключевых и предметных компетенций. – [Электронный ресурс] / А. В. Хуторской // Интернет-журнал "Эйдос". – 2005. – 12 декабря. – Режим доступа : http://www.eidos.ru/journal/2005/1212.htm. – Дата доступа : 21.12.2015.

3. Шур, В. В. З гісторыі ўласных імёнаў / В. В. Шур. – Мінск : Вышэйшая школа, 1993. – 156 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ